Источник: "Беларуская думка" - № 7, 2012-07-19



**Кто живет в Беларуси** / А.Вл. Гурко [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 799 с. – ISBN 978-985-08-1263-6.

Навукова-папулярнае выданне ўяўляе сабой збор артыкулаў прадстаўнікоў розных навуковых устаноў краіны і дае поўнае ўяўленне аб сацыяльнай, матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў, што пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Спрабуючы прадставіць чытачам нацыянальную палітру насельніцтва нашай краіны, аўтары, натуральна, пачынаюць з беларусаў і прысвячаюць ім значную частку артыкулаў. У гэтым раздзеле выкладаюцца гістарычныя звесткі пра паходжанне і асаблівасці рассялення нашых продкаў, пра дэмаграфічныя працэсы і ідэнтыфікацыю беларускага этнасу. Даследуюцца традыцыі жыллёвай і гаспадарчай забудовы, харчавання і адзення. Надзвычай цікавыя аповеды пра вераванні, абрады і звычаі, фальклор і рэлігійныя традыцыі беларусаў.




Асобныя раздзелы кнігі прысвечаны рускім, украінцам, палякам, яўрэям, татарам, літоўцам, якія пражываюць у Беларусі. Даследчыкі найперш прапануюць даведацца пра гістарычную аснову з'яўлення і рассялення гэтых нацый на беларускіх землях, расказваюць пра асаблівасці іх матэрыяльнай і духоўнай культуры. Распавядаючы пра іншыя этнічныя групы, прадстаўленыя ў нашай краіне, аўтары вылучаюць в'етнамцаў, карэйцаў, народы Каўказа, немцаў, цыганоў, афганцаў і японцаў. У кнізе асобна разглядаецца гісторыя канфесій і сучасная рэлігійная сітуацыя ў краіне.

Выданне найперш будзе карыснае для гісторыкаў, этнографаў, антраполагаў, фалькларыстаў, рэлігіязнаўцаў, але ў цэлым разлічана на шырокае кола чытачоў, што цікавяцца пытаннямі міжнацыянальных і міжканфесіянальных зносін.

**Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке** / О.Н. Левко [и др.]; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О.Н. Левко; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 743 с.: ил. – (Древнейшие города Беларуси). – ISBN 978-985-08-1410-4.

Манаграфія «Полацк» працягвае серыю фундаментальных прац па гісторыка-археалагічным вывучэнні старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Выхад гэтай кнігі прысвечаны значнай падзеі ў гісторыі нашай краіны – 1150-годдзю найстаражытнага горада ва Усходняй Еўропе і пачатку беларускай дзяржаўнасці. Выданне сталася вынікам больш як 80-гадовага – з 1928 па 2011 год – гісторыка-археалагічнага даследавання Полацка. Адначасова яно з'яўляецца і першай спробай аб'яднаць і абагульніць усе асноўныя навуковыя распрацоўкі, зробленыя айчыннымі гісторыкамі і археолагамі, якія вывучаюць горад.

Дзякуючы вялікай колькасці назапашаных матэрыялаў і даследаваных крыніц адносна гістарычнага мінулага Полацка і Полацкай зямлі, апошнім часам сфарміраваўся новы погляд на самы старажытны перыяд у гісторыі Полацка. Новыя распрацоўкі па гісторыі развіцця Полацкай воласці ў складзе Вялікага Княства Літоўскага таксама знайшлі адлюстраванне ў гэтай фундаментальнай працы.




У кнізе раскрываюцца самыя старажытныя старонкі гісторыі Полацка, прыводзяцца факты, вылучаюцца гіпотэзы наконт падзей, што сапраўды адбываліся тут. Разглядаецца таксама механізм зараджэння горада, яго станаўленне і развіццё. Аўтары даюць тлумачэнне многім гістарычным фактам, ацэньваюць гаспадарча-эканамічнае, сацыяльна-палітычнае і культурнае значэнне горада на розных этапах эпохі Сярэднявечча і ранняга новага часу.

Выданне адрасавана гісторыкам, археолагам, работнікам музеяў, выкладчыкам і студэнтам ВНУ, а таксама ўсім, хто цікавіцца старажытнай гісторыяй Беларусі.